Н.Л.Чарвонцава,
*выкладчык*

# ВЫЦІНАНКА ЯК З'ЯВА ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

У старажытныя часы дзейнасць часта мела магічную ролю, і гэта адлюстроўвалася ў знаках-сімвалах, якія потым пераўтварыліся ў арнамент. Выяўленчае мастацтва мела таксама сімвалічную функцыю, і кожны стыль эпохі ўносіў у яго свае тэмы і сюжэты. Яно сімвалічна і зараз, бо кожны жанр — гэта адлюстраванне адносін чалавека і быцця. Ён паказвае глыбіню разумення мастаком Сусвету на ўзроўні падсвядомасці.

Разглядаючы такую з'яву, як выцінанка, нам зразумела, што ў старажытным Кітаі, адкуль яна паходзіць, папяровая графіка адлюстроўвала пэўны сімвалізм і мела форму, якая адпавядала агульнаму стылю. З сакрэтам вырабу паперы яна пераносіцца праз краіны Блізкага Усходу ў Заходнюю Еўропу. І (пры захаванні прыёмаў працы) гэта майстэрства кожны раз насычаецца сімвалічным сэнсам і стылістычнымі прыёмамі, уласцівымі дадзенай краіне.

Цікава прасачыць развіццё выцінанкі ў Беларусі, якая цесна звязана з Заходняй Еўропай. Трапіў гэты від майстэрства да нас праз Польшчу. Гістарычна склаліся два напрамкі яго развіцця: шляхетны (элітны) і сялянскі (народны). Яны адрозніваліся па прыёмах пабудовы. У дваранскім і гарадскім асяроддзі выцінанка існавала як рэалістычная карціна або профільны партрэт, пабудаваны на выразнасці сілуэта. Выконваліся выцінанкі прафесійнымі мастакамі. Такія кампазіцыі ўпрыгожвалі сядзібныя інтэр'еры і дамскія альбомы. Гэты напрамак развіцця выцінанкі знаходзіўся ў шчыльнай сувязі з агульнаеўрапейскім.

Існавалі з'явы на мяжы народнай і элітнай эстэтыкі. Прыкладам можа служыць батлейкавы ценявы тэатр, які



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на хвалі контррэфармацыі прыйшоў праз каталіцызм у Беларусь. Майстрамі з народу выразаліся дзеючыя асобы Святога Пісання, але ў іх сілуэтах выяўляюцца стылеўтваральныя рысы барока.

Народная выцінанка мае зусім іншае паходжанне. Час яе бытавання даволі позні (канец XIX — пачатак XX ст.). Таму было некалькі прычын: пашырэнне вырабу паперы і яе даступнасць, змены ў сялянскім інтэр'еры (сцены бяліліся). Рабіліся з паперы сурвэткі, фіранкі на вокны, прасценкі паміж імі аздабляліся сюжэтнымі кампазіцыямі сімвалічнага зместу. Па сутнасці, выцінанка замяняла каштоўныя матэрыялы (ручнікі, падзоры). Але, нам здаецца, прывабнасць гэтага майстэрства не толькі ў гэтым. Не толькі з-за беднасці сялянка бралася за нажніцы, не толькі з-за адраджэння народнага мастацтва рэжуць узоры з паперы прафесійныя мастакі зараз.

Па нашым меркаванні, у аснове пабудовы народнай выцінанкі ляжыць універсальны прынцып сіметрыі як асновы светабудовы. Калі звернемся да навуковых дысцыплін, напрыклад біялогіі, матэматыкі, літаратуры (асабліва казкі), музыкі, то ўбачым адлюстраванне сіметрыі ў кожнай з іх рознымі спосабамі.

У выцінанцы выкарыстоўваюцца тры віды сіметрыі: радыяльная, рапортная, або лінейная, і люстраная.

Радыяльная сіметрыя нагадвае пабудову Сусвету. У архаічным мастацтве радыяльная сіметрыя мела універсальную форму мандалы. Мандала ў перакладзе з санскрыту абазначае *круг*. Яна мае цэнтр і чатыры асноўныя напрамкі. Найбольш гэтая форма насычана сімволікай у народаў Усходу. У будызме яна існуе як форма медытацыі. У нашым мастацтве мандала існуе ў выглядзе сурвэтак, узораў, арнаментаў, вышыўкі і ткацтва.

Лінейная сіметрыя (рапортная) з пераносам паралельных восей адлюстроўвае наступовы рух, ўвасабленне бясконцага часу — чацвёртага вымярэння нашага матэрыяльнага існавання. Гэта таксама цыклічнасць, якой падпарадкоўваюцца прырода і жыццё чалавека.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Люстраная сіметрыя паказвае міфалагічную свядомасць як тып калектыўнай свядомасці першабытных людзей: зло — дабро; месяц — сонца; адмоўны — станоўчы; жанчына — мужчына; левае — правае.

Але ж правы і левы бакі падобныя, як падобныя мужчына і жанчына, у святле ёсць цемра, а ў цемры — святло, і іншы раз цяжка вызначыць, добро ці зло напаткала нас.

Выкарыстоўваючы такія простыя прыёмы, як складанне паперы па розных восях, чалавек уключаецца ў сусветную "гульню" з асновамі быцця. Той, хто гэтым займаўся, пацвердзіць захапляльную магію сіметрыі.

Старажытнае майстэрства ў руках сучасніка — вынік яго асабістых стасункаў з Сусветам. Разглядаючы выцінанкі Беларусі, можна вылучыць некалькі напрамкаў іх развіцця: аўтэнтычны — узнаўленне ў паперы старажытных узораў вышыўкі, ткацтва, карункаў у форме сурвэтак, фіранак, сюжэтных кампазіцый; архітэктурны — калі выбіраецца найбольш выразны бок будынка, часцей за ўсё фасад, і робіцца кампазіцыя; сімвалічны — ствараецца абстрактная кампазіцыя. Сімвалы асэнсоўваюцца ў свеце сучасных ведаў па культуралогіі, знакавых сістэм. Можна назваць гэты напрамак неаміфалагічным мысленнем. Безумоўна, усе напрамкі спалучаюцца паміж сабой.

Разгледзім іх на прыкладзе дыпломных работ выпускнікоў дэкаратыўнага аддзялення Маладзечанскага музычнага вучылішча імя М.К.Агінскага.

Прыкладам узнаўлення старажытных узораў служыць дыпломная работа на тэму "Выцінанка ў старажытным і сучасным інтэр'еры" (1997). Аўтар робіць спробу адрадзіць сялянскую выцінанку, выкарыстоўваючы веды па народных святах, звычаях, міфалогіі, і асэнсаваць філасофію народнага мастацтва.

Дыпломная работа "Каляды" (1998) — таксама зварот да вытокаў і імкненне перадаць эмацыянальны стан свята праз сучаснае разуменне. Сілуэтныя кампазіцыі тут

скампанаваны ў форму мандалы, бо Каляды сімвалізуюць нараджэнне новага сонца, якое і паказана ў цэнтры як калядная зорка. Выдатна знойдзены колер паперы — глыбока-сіні з увядзеннем жоўтага і чырвонага золата. Каляровы строй адпавядае святочнасці, казачнасці, карнавальнасці, якія ўласцівы менавіта Калядам.

У рабоце "Старажытны сусвет беларуса" (1999) ставіцца звышзадача — абагульніць праз форму мандалы народны каляндар на падставе стылізацыі арнаментаў. Дыпломная работа мае форму васьмівугольніка, які, у сваю чаргу, складаецца з аналагічных формаў меншага памеру. Кожная з іх сімвалізуе адно з гадавых свят: Сёмуху, Жніво, Купалле, Юр'я і інш. Усе яны адлюстроўваюць шлях Сонца ад "нараджэння" да "паміранне". Сонца паказана праз чырвоны колер у цэнтры кожнай мандалы. Дыплом вытрыманы ў чорна-чырвона-белых колерах, якія надаюць урачыстасць і ўзнёсласць рабоце. Сэнсам яе з'яўляецца не толькі ўзнаўленне памяці аб продках, але і пошукі асабістай трываласці праз асэнсаванне сваіх каранёў.

Узнаўленню гістарычных формаў прысвечана работа "Батлейка" (1998), зробленая ў форме дзіцячай кнігі. Тэхніка выцінанкі адпавядае напружанню і барацьбе паміж чорным і белым на лісце паперы і паміж дабром і злом у драме "Цар Ірад".

Першая спроба спалучыць народную і шляхетную выцінанку адчуваецца ў дыпломнай рабоце "Род Радзівілаў" (1999), задуманай як кніга для дзяцей.

У дыпломнай рабоце "Дрэва жыцця ў народаў свету" (1997) разглядаецца тэма дрэва ў агульнасусветным кантэксце, аўтар спрабуе знайсці яго непаўторныя рысы, характэрныя менавіта для Беларусі.

Архітэктурная тэматыка знайшла адлюстраванне ў калектыўнай працы "Архітэктура Беларусі", выкананай у форме календара. У рабоце "Белы ветразь над Дзвіной" (1998) знойдзены цікавы прыём падвоенага сілуэта Полацка, які нагадвае аўрычнае святло. У яго цэнтры як сімвал духу знаходзіцца крыж св. Ефрасінні Полацкай.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Чакаюць дыпломных распрацовак тэмы народных і шляхетных строяў, гістарычных падзей і інш.

Абагульняючы сказанае, адзначым, што мы маем падставу гаварыць аб архетыпах. Паводле тэорыі К.Г.Юнга, архетып — гэта праваобраз, знак будучай пабудовы. Ён нагадвае восі крышталізацыі рэчыва. Як у спрыяльных умовах утвараецца крышталь, так і ў розных народаў — аднолькавыя сюжэты казак, архаічная сімволіка, філасофскія думкі.

Такім чынам, сёння мы назіраем адраджэнне архетыпаў, якія прыводзяць шмат людзей у Беларусі да заняткаў выразання папяровых узораў.

Трэба заўважыць, што ў нас досыць высокая графічная культура, якая ідзе яшчэ з часоў Ф.Скарыны. Выцінанка шмат у чым нагадвае гравюры на дрэве: тыя ж напружанне, барацьба паміж чорным і белым, паміж фонам (хаосам) і формай (праяўленнем). Таму і майстэрства гэта, раз з'явіўшыся, перажыўшы заняпад, зноў адраджаецца, яно не згіне, не згубіцца ў часе, бо гэта частка нашай душы.

С.В.Строгіна,
*нам. дырэктара Магілёўскага абласнога мастацкага музея*

## ЗАХАВАНАЯ СПАДЧЫНА

Традыцыйна экспанаты арганізаваных яшчэ ў XIX ст. Магілёўскага музея (1867) пры губернскім статкамітэце і Магілёўскага царкоўна-археалагічнага музея (1897) звязаны з мясцовым краем, яго мастацтвам і культурай.

Наш край на працягу стагоддзяў даваў беларускай культуры таленавітых майстроў-рэзчыкаў па дрэве і іканапісцаў: Клім Міхайлаў, Восіп і Сцяпан Івановы, Якаў Магілёвец і Пётр Фёдараў. Вядомы помнікі іканапісу з Басценавіч, Галынца, Быхава. Магілёўская школа гравюры XVII ст. знайшла сваё ўвасабленне ў данесеных да нас творах Фёдара Ангілейкі, Васіля і Максіма Вашчанкаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ